*Т.М.МАРМЫШ*

# АРХЕТЫПЫ ЛАКАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

*Раскрываецца сутнасць феномена лакальнай ідэнтычнасці, падкрэсліваецца атрыбутыўнае значэнне архетыпаў для быцця любой этнакультурнай супольнасці. На прыкладзе “тутэйшасці”, якая з’яўляецца традыцыйнай гісторыка-культурнай формай лакальнай ідэнтычнасці ў беларускай культуры, вылучаюцца і характарызуюцца асноўныя архетыпы лакальнай ідэнтычнасці: зямля, хата (дом), месца, мяжа.*

Сучасная сацыякультурная прастора характарызуецца суіснаваннем дзвюх тэндэнцый. З аднаго боку – глабалізацыя, што вядзе да сацыяпалітычнай, эканамічнай і культурнай гамагеннасці свету, а з другога боку – назіраецца працэс сацыякультурнай дыферэнцыяцыі этнанацыянальных утварэнняў.

Пад уплывам шэрагу мадэлей культурных узаемадзеянняў можна назіраць розныя праяўленні этнакультурнай і нацыянальнай прыналежнасці, якія знаходзяцца ў дыяпазоне ад поўнай індыферэнтнасці і да этнічнага фанатызму, што часта прыводзіць да этнічных канфліктаў [1, с. 177–179]. У кантэксце гэтага цалкам абгрунтавана сцвярджаць аб ўсё больш узрастаючай значнасці ідэнтыфікацыйных працэсаў і значэнні лакальнай ідэнтычнасці – тоеснасці этнафораў на аснове лакальнай культуры, што характарызуецца ўласнымі асаблівасцямі моўнага, рэлігійнага, бытавога характару, варыяцыямі мастацка-эстэтычных поглядаў носьбітаў гэтай культуры і адпаведнай формай ідэнтычнасці. Лакальная ідэнтычнасць звязана з сітуацыяй “тут-і-цяпер”, базіруецца на прасторава-тэрытарыяльнай лакалізацыі асобы, укаранёнасці чалавека ў прыродна-геаграфічны ландшафт жыцця.

Мэта дадзенай работы заключаецца ў выяўленні архетыпаў лакальнай ідэнтычнасці беларусаў і ўдакладненні іх сутнасных характарыстык.

Гістарыяграфію разглядаемага пытання складаюць агульнатэарэтычныя работы па культуралогіі, філасофіі, этналогіі, этнапсіхалогіі, сацыяльнай псіхалогіі і іншых навуках, прысвечаныя распрацоўцы канцэпту “ідэнтычнасць”, і даследаванні культурна-псіхалагічных асаблівасцей этнакультурных супольнасцей.

Распрацоўка паняцця “ідэнтычнасць” мае параўнальна нядоўгую гісторыю і традыцыйна адносіцца да сацыяльна-псіхалагічных даследаванняў.

З’яўленне ў навуковай практыцы тэрміна “ідэнтычнасць” звязваюць з працамі З.Фрэйда. Далейшая эвалюцыя праблемы прасочваецца ў Т.Парсанса, Ж.Піяжэ, Г.Тэджфела, Э.Фрома, С.Хантынгтона, Дж.Цёрнера, Э.Эрыксана, Ю.В.Аруцюняна, Л.С.Выгоцкага, Л.М.Дробіжавай, Б.Ф.Поршнева, А.П.Садохіна, Т.Г.Стэфаненка, В.Ю.Хоцінец, У.А.Ядава, М.Н.Беспамятных, Л.Р.Цітарэнка, Ю.В.Чарняўскай і інш.

Даследаванні Ф.Боаса, Г.Гегеля, І.-Г.Гердэра, Э.Дзюркгейма, К.Дю Буа, Дж.Кулі, К.Леві-Строса, М.Мід, К.-Г.Юнга, І.М.Браіма, Ю.У.Брамлея, М.І.Надзеждзіна, Г.Г.Шпета, І.Абдзіраловіча, Я.Ф.Карскага, А.П.Мельнікава, Т.М.Мікуліч, П.М.Шпілеўскага і іншых адносяцца да крыніц па вывучэнні культурна-псіхалагічных асаблівасцей этнасаў.

Значнымі для дадзенай работы з’яўляюцца ідэі К.-Г.Юнга, які тэарэтычна распрацаваў феномен “калектыўнага неўсвядомленага” – крыніцы чалавечай агульнасці, што складаецца з архетыпаў – моцных псіхічных першасных вобразаў, універсальных мадэлей канцэнтрацыі вопыту, назапашанага калектыўна ўсімі папярэднімі пакаленнямі.

К.-Г.Юнг вылучаў шэраг універсальных архетыпаў (Аніма, Анімус, Персона, Цень, Самасць, Мудрэц і інш.) і падкрэсліваў сувязь кожнага архетыпа з тэндэнцыяй выяўляць пэўнага роду пачуцці і думкі ў адносінах да адпаведнага суб’екта ці сітуацыі, падказваць кірунак дзейнасці [11, с. 19].

Архетыпы ляжаць у аснове быцця любой этнакультурнай супольнасці. Розныя культуры могуць мець адпаведныя мадыфікацыі архетыпаў – этнакультурныя архетыпы, якія характарызуюць асноватворныя ўласцівасці супольнасці, уплываюць на менталітэт, асаблівасці светаўспрымання, духоўныя арыентацыі і сацыякультурная набыткі яе членаў.

Традыцыйнай гісторыка-культурнай формай лакальнай ідэнтычнасці ў беларускай культуры з’яўляецца “тутэйшасць”, першыя зафіксаваныя дакументальна пацвярджэнні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наяўнасці якой з'явіліся ў канцы XIX ст.: з дапамогай саманазвы "тутэйшы" канкрэтызавала сваю нацыянальную (этнакультурную) прыналежнасць частка беларускага насельніцтва паводле Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г.

Узнікненне тутэйшасці як формы ідэнтычнасці беларусаў было звязана з дзеяннем многіх фактараў, а перш за ўсё палітыка-сацыяльнымі зрухамі пачынаючы з другой паловы XVI ст. і да XIX ст. Пераменнае ўздзеянне польскай і рускай культур прывяло да таго, што беларускае сялянства набыло пачуццё этнічнай няпэўнасці і вырашала праблему нацыянальнай прыналежнасці праз самаідэнтыфікацыю, заснаваную на месцы пражывання: «...если вы къ такимъ бѣлоруссамъ обратитесь съ вопросомъ – кто они такіе въ смыслѣ національности, то очень многіе вамъ только и могутъ сказать, что они "тутэйшіе", т.е. здѣшніе ... И къ вашему заявленію, что они русскіе или бѣлоруссы, они отнесутся довольно скептически: называй, дескать, какъ хочешь...» [2, с. 4–5].

Такім чынам, праз тутэйшасць, па-першае, выражалася сацыяльна-палітычная і нацыянальная індыферэнтнасць і, па-другое, выяўляліся моцная лакалізацыя і самабытнасць цэнтральнай зоны культуры, кансерватыўнасць кодавых сімвалаў культуры, знітаванасць формаў жыцця і камунікацыі з кантэкстам тэрыторыі пражывання.

Фундаментальнае значэнне для тутэйшага набылі архетыпы, прадстаўленыя прасторавымі маркерамі – вобразамі зямлі (глебы), хаты, мяжы. Зямля – аснова быцця тутэйшага як ва утылітарным сэнсе, так і ў духоўным. Паміж глебай як аб'ектыўнай рэчаіснасцю і чалавекам-суб'ектам існуе ўзаемазваротная сувязь [8, с. 113]. Зямлі ўласціва персаналізаванае ўвасабленне, яна – жывая істота – Зямля-маці, Зямля-карміцелька. Адносіны тутэйшага да зямлі маюць фетышысцкі характар: "Отправляясь въ чужую сторону, бѣлоруссъ, слѣдующій обычаямъ предкавъ, беретъ щепотку родной земли и, зашивъ ее въ лоскутокъ холста, вѣшаетъ на груди: если придется умереть на чужбинѣ, то его прахъ всеже будет покоиться вмѣстѣ съ родной землицей" [2, с. 20]. Гэта тлумачыцца перш за ўсё залежнасцю дабрабыту, асабістага, сямейнага і грамадскага жыцця чалавека ад наяўнасці зямлі, яе стану, ад вынікаў працы на зямлі.

Зямля для тутэйшага не проста месца пражывання, а фундамент і цэнтр быцця. Гэта добра бачна на прыкладзе падзелу свету па вертыкалі, які дае ўяўленне аб прычынах і наступствах пэўных з'яў, ілюструе іх этычныя параметры, семантыку свету. Так, прастору тутэйшага можна падзяліць на тры сферы – Неба, Зямля і Падзем'е. Важна адзначыць, што такі падзел, безумоўна, адбываўся адносна чалавека і зямлі, на якой чалавек жыў.

Неба і Падзем'е з'яўляюцца сферамі існавання сакральнага і інфернальнага, месцамі знаходжання багоў, хтанічных істот і памерлых. Зямлю ж насяляюць чалавек, жывёлы, расліны і міфалагічныя істоты; гэта сфера – блізкая, знаёмая, але толькі ў тым выпадку, калі зямля – "свая", "асвоеная". Гэта звязана з фундаментальным значэннем для культуры дыхатамій "Я–Ты", "Мы–Яны", "Сваё–Чужое". Усё, што адносіцца да сфер "Ты" або "Яны", з'яўляецца "іншым", з аднаго боку – негатыўным (варожым і невядомым), а з другога – пазітыўным (цікавым і прыцягальным) і таму магчымым ў якасці аб'екта пазнання і засваення.

Ю.М.Лотман вылучыў два матывы, якія абумоўліваюць жаданне засвойваць і пазнаваць "іншае":

1) трэба, бо зразумелае, знаёмае ўпісваецца ў вядомыя мне ўяўленні і каштоўнасці;

2) трэба, бо незразумелае, незнаёмае не ўпісваецца ў вядомыя мне ўяўленні і каштоўнасці [4, с. 110].

Для тутэйшага "сваё" абмяжоўваецца хатай – дваром – вёскай. Упарадкаваны Космас – гэта асвоенае поле, луг, бліжэйшае возера, лес, а засваенне "іншага" і "чужога" можа адбывацца толькі вымушана, як спосаб самазахавання і адаптацыі, у выніку знешняга ўздзеяння гэтага "іншага", а не па ўнутранай ініцыятыве.

Архетып "месца" становіцца актуальным у кантэксце гаворкі аб лакальнай ідэнтычнасці, таму што гэты феномен грунтуецца на ўкаранёнасці асобы ў пэўнае месца, што можа ажыццяўляцца праз стварэнне могілак (качавыя плямёны, напрыклад, не маючы канстантнага месца жыцця, не рабілі іх), надзяленне прыродных аб'ектаў антрапаморфнымі або звышчалавечымі ўласцівасцямі, праз пабудову жылля, якое служыць не аднаму пакаленню [6, с. 220].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметным фактам з’яўляюцца неаднароднасць і разнастайнасць прасторы знаходжання тутэйшага: «...кожнае места – прынамсі, патэнцыйна – аказваецца семантычна зараджаным. Апошняе вызначаецца той або іншай ступеньню раскрывальнасьці фундамэнтальных анталягічных магчымасьцяў, г.зн. тым, што прынцыпова можа быць у дадзеным месцы. Некаторыя месцы трывала маюць даволі высокі сэміятычны статус... Гэта месцы тэафаніі, месцы, дзе магчымыя кантакты з найвышэйшымі сэнсамі быцьця, месцы судотыку “гэтага сьвету”, сьвету абыдзённасьці з сакральным сьветам. Ёсьць і іншыя месцы – патэнцыйна небясьпечныя, а то й проста інфэрнальныя, дзе гэты сьвет прыходзіць у судотык з самым прадоньнем быцьця» [9, с. 11].

Такая неаднароднасць выражаецца ў шматлікіх актах дзеяння міфалагічных істот і духаў у пэўных месцах навакольнай прасторы, сакральных локусах, якія набываюць семантычнае значэнне дзякуючы гэтым істотам і духам: у хаце жывуць дамавік і дамавуха, пячурнік; сярод насельнікаў сядзібы можна ўзгадаць хлеўніка, гуменніка, лазніка; у лесе гаспадараць лясун, расамахі, змяіны цар, гаёвы дзед і гаёўкі; вадаёмы насяляюць вадзянік, русалкі, азярніцы; кладнік, жыж, чорт, пякельнікі, прахі – жыхары падзямельнага свету і пекла. Існуюць духі неакрэсленай прасторы: бадзюля, хіхітун, цмок, ератнікі, шэшкі і інш.

Некаторыя з “нячысцікаў” маюць выключна дэстабілізуючыя функцыі, іншыя – спрыяюць гаспадарцы. Дзеянні іх цалкам залежаць ад паводзін уласніка жылля: калі гаспадар працавіты і руплівы, то духі дапамагаюць яму, у добрага гаспадара хатнік наглядае за парадкам у хаце, а калі хатнік сваволіць, значыць, гаспадар – гультай.

З найстаражытнейшых часоў да ліку важнейшых сімвалаў культуры, архетыпічных вобразаў, што функцыянуюць у чалавечай свядомасці, адносіцца “дом”: “...Дом – гэта артыкуляваная ў адчувальных матэрыялах думка з нагоды самабудовы чалавека; гэта яго цэнтр светастварэння...” [5, с. 217].

Неабходнасць мець сваю хату (дом), атрымаць яе гатовую, правесці ў ёй усё жыццё з’яўляецца важным для носьбіта лакальнай ідэнтычнасці [7, с. 206]. Вялікае значэнне хаты для тутэйшага праглядаецца ў фактах прычытанняў нявесты, якая пакідае бацькоўскую хату, у абавязковым рытуальным развітанні рэкрута з усімі кутамі жытла. Значнасць уласнай “доўгатэрміновай” хаты ілюструюць пажаданні простага чалавека, які “кожнаму хрышчонаму зычыць” нарадзіцца і памерці ў сваёй хаце. З гэтым карэлюецца і павер’е, згодна якому той, хто нарадзіўся і памёр у адным і тым жа месцы, не бярэ з сабой у магілу цяжкіх грахоў [7, с. 207].

Хата аберагае чалавека ад знешняга асяроддзя, стварае атмасферу бяспекі, вызначанасці, арганізаванасці, супрацьпастаўленай знешняму хаосу. Асабісты дабрабыт гаспадара ёсць прамы вынік дабрабыту хаты, які перадаецца спадчынна. Дабрабыт будзе толькі ў тым выпадку, калі хата стаіць на “дѣдывщине або бацькывщини” і ў асаблівасці “на своей вѣчнысци ци вячнинки” (на ўласнай зямлі) [7, с. 207]. Хата, знаходзячыся на зямлі і ў той жа час узвышаючыся над ёй, злучае зямлю і неба. Яна з’яўляецца для свайго гаспадара цэнтрам гарызантальнага і вертыкальнага падзелу сусвету, сімвалізуе цэнтр жыццёвай прасторы.

Імкненне да сувязі хатняй арганізацыі з боскім парадкам і абаронай ад знешніх сіл выявілася ў стварэнні або абазначэнні ў прасторы хаты сакральнага месца – чырвонага кута, які разам з печчу – яшчэ адным важным рытуальным цэнтрам жылля – абазначаецца ў якасці асноўнага атрыбута хаты: “Своеасаблівай воссю жытла выступае дыяганаль кут – печ, якая адным канцом (покуць) паказвае на святло, усход, божы бок, а другім (печ) – на захад, цемру...” [3, с. 527–528].

Адзін з шэрагу найбольш значных архетыпаў для быцця тутэйшага – архетып “мяжа”, які праяўляецца ў рэальных вобразах (мае прадметнае ўвасабленне: “парог”, “вароты”, “дзверы”), а таксама ва ўяўных феноменах і мае галоўныя функцыі:

1) структурызацыі свету;

2) адгароджвання “сваёй прасторы” і яе насельнікаў ад дзеяння знешніх сіл.

Прастора хаты абмежавана парогам, падворак – варотамі. Такая “мяжа” дзеліць свет на “свой” і “чужы” і з’яўляецца “небяспечнай” зонай. “Дзверы” звязваюць хату са знешнім светам – адсюль і выяўляюцца іх містычнае значэнне і неабходнасць ачышчэння ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нячысцікаў – спараджэнняў хаосу [10, с. 46–47]. З гэтай мэтай над дзвярыма ці каля іх размяшчаліся рознага выгляду абярэгі – конская падкова, сякера ці каса, нож лязом да двара.

Уяўныя межы актуалізуюцца ў час абрадаў і рытуальных дзеянняў. Так, абрад кругавога баранавання зямлі вакол вёскі – спосаб зберагчыся ад сіл хаосу праз размежаванне прасторы жыцця чалавека, "сваёй" прасторы і навакольнага "чужога" прыроднага асяроддзя з дапамогай абазначэння на зямлі мяжы. У старажытныя часы магічнае кола праводзілі ў асабліва важных і драматычных для грамады выпадках, напрыклад у час стыхійных бедстваў.

Уяўная мяжа паміж "сваім" і "чужым" як зона звышнатуральных кантактаў людзей з сіламі "іншасвету" рухомая. Яе зменлівасць абумоўлена зменай дня ноччу: з надыходам цемры пашыраецца "чужы", "іншы", з наступленнем святла – "свой" свет.

Такім чынам, сярод універсальных архетыпаў лакальнай ідэнтычнасці намі вылучаюцца архетыпы "зямля", "хата" (дом), "месца", "мяжа". На наш погляд, менавіта на сувязі асобы з зямлёй, месцам пражывання, хатай заснавана сутнасць паняцця "лакальная ідэнтычнасць".


1. *Арутюнян, Ю.В.* Этносоциология: учеб. пособие для вузов / Ю.В.Арутюнян, Л.М.Дробижева, А.А.Сусоклов. – М.: Аспект-Пресс, 1999. – 261 с.

2. *Богданович, А.Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов: этногр. очерк / А.Е.Богданович. – Гродно: Губ. тип., 1895. – [2], III. – 186 с.

3. *Валодзіна, Т.* Хата / Т.Валодзіна // Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўнік / С.Санько [і інш.]; склад. І.Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.

4. *Лотман, Ю.М.* К построению теории взаимодействия культур (семиотический аспект) / Ю.М.Лотман // Избранные статьи: в 3 т. / Ю.М.Лотман. – Таллинн, 1992. – Т.1. – С. 110–120.

5. *Морозов, И.В.* Основы культурологии: архетипы культуры / И.В.Морозов. – Мн.: ТетраСистемс, 2001. – 608 с.

6. *Морозов, И.В.* Таинственным путем Гермеса / И.В.Морозов. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 302 с.

7. *Никифоровский, Н.Я.* Очерки простонародного бытья в Витебской Белоруссии и описания предметов обиходности: (этнографические данные): с географическим видом Витебской губернии и четырьмя чертежами в тексте / Н.Я.Никифоровский. – Витебск: Губернская типография, 1895. – [4], VIII. – 552 с.

8. *Санько, С.* Канстытутыўныя элемэнты антычнага космасу як эталённага для стараэўрапейскай тэсматычнай культуры / С.Санько // Kryŭja: Crivica. Baltica. Indogermanica. – 1994. – № 1. – С. 104–126.

9. *Санько С.* Некаторыя падставовыя прасторавыя і часавыя структуры ў беларускім фальклёры / С.Санько // Kryŭja: Crivica. Baltica. Indogermanica. – 1998. – № 1. – С. 11.

10. *Шамякіна, Т.І.* Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапам. / Т.І.Шамякіна. – Мн.: Маст. літ., 2000. – 398 с.

11. *Юнг, К.-Г.* Душа и миф. Шесть архетипов / К.-Г.Юнг; перевод. – М.: АСТ; Мн.: Харвест, 2005. – 398 с.



*T.MARMYSH*


**THE ARCHETYPES OF LOCAL IDENTITY OF THE BELARUSSIAN**


The research is devoted to the archetypes of local identity in the context of its attributive value for life of any ethnic and cultural community. The concept "local identity" means the form of identity which is connected with the given territory, situation "here-and-now" and based on a spatial localization.

"Tytejshest" is a traditional historical and cultural form of local identity in the culture of Belarus. The author investigated the basic archetypes of local identity used by "tytejshest". They are "ground", "home", "place" and "border".


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ